**У. Ф. Красюк,**
*дацэнт кафедры філасофіі,*
*кандыдат філасофскіх навук*

# АСАБЛІВАСЦІ ВЫКЛАДАННЯ ДЫСЦЫПЛІНЫ «ПАЛІТАЛОГІЯ» Ў ФАРМАЦЕ ІНТЭГРАВАНАГА МОДУЛЯ «ПАЛІТАЛОГІЯ»

Якасць засваення студэнтамі ведаў па найважнейшых сферах жыцця сучаснага грамадства, напрыклад паліталогіі, выклікае пытанні. З аднаго боку, у свеце сучасных уяўленняў аб дастатковай, нават высокай дасведчанасці нашай моладзі аб працэсах грамадскага жыцця ў краіне і свеце лічыцца мэтазгодным выдзеліць больш вучэбнага часу для вывучэння прафіліруючых дысцыплін. Рэзон ёсць, тым больш, што галоўная мэта навучальнай установы – падрыхтоўка высокаадукаваных спецыялістаў. Пакуль яшчэ не зусім высакакваліфікаваных – пэўную кваліфікацыю яны набудуць па меры сваёй прафесійнай дзейнасці. А вось адносна высокай адукаванасці можна казаць адназначна – без добрых ведаў па палітычнай, эканамічнай, культуралагічнай, экалагічнай і іншай праблематыцы, без філасофскіх уяўленняў добрых спецыялістаў падрыхтаваць нельга.

Перад гуманітарыямі сёння стаіць задача ажыццяўляць вучэбна-педагагічную дзейнасць ва ўмовах рэалізацыі інтэграваных модуляў і спецыяльных модуляў па выбары. Дысцыпліна «Паліталогія» аказалася ў звязку з дысцыплінай «Асновы ідэалогіі беларускай дзяржавы». Як мяркуецца, гэта павінна забяспечыць комплекснасць у набыцці студэнтамі адпаведных ведаў, спрыяць павышэнню якасці засваення матэрыялу.

Аднак ёсць пытанні метадалагічнага і практычнага плана. Так, прыходзіцца студэнтам стацыянара замест ранейшых 25 лекцый даваць толькі 4 лекцыі і 5 семінарскіх заняткаў. Зразумела, выпадае шэраг найважнейшых тэм, якія неабходна менавіта ва ўмовах аўдыторных заняткаў прапрацаваць, каб студэнты ўсвядомілі складаныя палітычныя працэсы, якія адбываюцца ў нашай краіне і ва ўсім свеце. Напрыклад, актуальнымі сёння з’яўляюцца праблемы тэрарызму, мадэрнізацыі грамадства ў цэлым і палітычнай мадэрнізацыі ў прыватнасці, геапалітыкі з яе дылемай «аднапалярнасць–многапалярнасць», суадносіны палітыкі і рэлігіі і інш.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Застаецца выкладаць гэтыя тэмы альбо на семінарскіх заняткках, альбо ўносіць іх у план самастойнай работы студэнтаў. Аднак семінарскія заняткі прызначаны для замацавання тэм лекцый. Таму застаецца самастойная работа. Аднак тут не ўсё добра. Дэканат выдзяляе некалькі гадзін для кіруемай самастойнай работы, якая разумеецца як самастойная работа студэнтаў, што выконваецца па заданні і пры метадычным кіраўніцтве прафесарска-выкладчыцкага саставу. А як быць з тымі 20 гадзінамі, што прадугледжаны эксперыментальнымі вучэбнымі праграмамі інтэграванага модуля «Паліталогія» для ўстаноў вышэйшай адукацыі? Невядома. Падключаць іх да КСП, даваць іх на «водкуп» студэнтам ці астаўляць іх сімвалічна на падрыхтоўку да заліку?

Што датычыцца самога заліку, то практыка пакажа мэтазгоднасць сумяшчэння дзвюх дысцыплін. Але вось першыя ўражанні: павялічылася доля арганізацыйных працэдур, бракуе якасці ведаў, кладзецца дадатковая нагрузка на дэканаты і кафедры.

Адносна выкладання самой дысцыпліны можна заўважыць наступныя рысы. Тэматыка лекцый і семінарскіх заняткаў дадзена ў новай вучэбнай праграме. Па задуме яе аўтараў, павінны быць раскрыты галоўныя, неабходныя для навучання аспекты палітычнай рэчаіснасці, рэаліі сучасных грамадска-палітычных працэсаў. Пры ўсёй апраўданасці такога падыходу трэба адзначыць, што мае месца фрагментарнасць у засваенні тэарэтычнага поля дысцыпліны. Як вядома, у навучальным працэсе павінна захоўвацца ўзаемасувязь паміж раздзеламі выкладаемага матэрыялу. Дысцыпліна ўстановы вышэйшай адукацыі павінна быць рэалізацыяй цэласнай паліталагічнай канцэпцыі, у якой прадугледжваецца «састыкоўка» разглядаемых тэм. Скажам, пры разглядзе тэмы «Палітычныя інстытуты ў Рэспубліцы Беларусь і сучасным свеце» неабходны веды аб ролі палітычных эліт, палітычных лідараў, сутнасці палітычных патрэбнасцей і інтарэсаў розных сацыяльных слаёў грамадства. А як раз на гэтыя пытанні, як і на іншыя, аўдыторных заняткаў не адпушчана. Пра тое, каб закрануць альтэрнатыўныя падыходы да гэтых праблем і гаворкі не можа быць – не хапае ні часу, ні папярэдне вывучанай базы. А ў сучасных сродках масавай інфармацыі, у Інтэрнэце падаецца мноства разнастайнага матэрыялу, часам спекулятыўнага характару.



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Параметры заліку прадугледжваюць увесь блок тэм дысцыпліны. Такім чынам, пытанні, якія не ўвайшлі ў склад аўдыторных заняткаў, павінны вывучацца студэнтамі самастойна. У плане кіруемай самастойнай работы выкладчыку неабходна арганізаваць працу студэнтаў адпаведна задачам вышэйшай школы на сучасным этапе. Для гэтага неабходна выкарыстоўваць пэўныя метадалагічныя падыходы, якія павінны забяспечыць эфектыўныя прыёмы вырашэння дадзеных праблем ва ўмовах бягучых трансфармацыйных працэсаў, спрыяць станаўленню інавацыйнай культуры будучых спецыялістаў.

Мэтазгодна спланаваць адпаведную інавацыйную мадэль, якая дазволіць выкладчыку арыентавацца ў новых умовах тэхналогіі выкладання. Яна ўяўляе сабой неабходны комплекс арганізацыйных, інфармацыйных, метадычных і тэхнічных мерапрыемстваў, накіраваных на аптымальныя магчымасці выкладання і вывучэння дысцыпліны «Паліталогія». Выдзелім тыя аспекты, якія апраўдана прымяняюцца для вучэбна-педагагічнай практыкі нашага ўніверсітэта.

Абавязковай умовай здзяйснення працы па вывучэнні студэнтамі палітычнай навукі з’яўляецца ўсведамленне імі важнасці, значнасці гэтай дысцыпліны. Адносіны да сацыяльна-палітычнай праблематыкі для студэнцкай моладзі яшчэ не набылі першаснага значэння, хаця ў работнікаў сферы культуры дадзеная праблематыка заўсёды ідзе побач з іх прафесійнай дзейнасцю. Не сакрэт, што многія студэнты несур’ёзна ставяцца да вывучэння гэтай дысцыпліны. Лепшае рашэнне тут – сувязь выкладання з практыкай рэальнага жыцця (удзел студэнтаў у выбарах, самастойны аналіз палітычных падзей і т. д.).

Неабходнай метадалагічнай перадумовай дзейнасці выкладчыка з’яўляецца дыферэнцаваны падыход да асаблівасцей вучэбнай спецыяльнасці. Тут неабходна папярэдняя накіраванасць выкладання з улікам спецыфікі факультэтаў, паступовае адхіленне застарэлых прыёмаў і метадаў, укараненне новых. У гэтым дапаможа праектаванне дзейнасці. Перш за ўсё, гэта раскрываецца ў распрацоўцы інавацыйных праектаў рознага ўзроўню. Іх роля заключаецца ў канструяванні вучэбнага дыялогу на розных факультэтах. Паколькі палітычныя веды набываюцца не толькі па вучэбных праграмах, але і з самой палітычнай рэчаіснасці, то паўстае пытанне аб змесце паступаючай інфармацыі. Узнікае патрэбнасць стварэння інфармацыйнага

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

мадэлявання адукацыйнага працэсу, у якім задачай выкладчыка з’яўляецца, напрыклад арыентаванне студэнтаў на аб’ектыўнае ўспрыманне і аналіз інфармацыі, што пастаўляюць СМІ.

Найважнейшымі метадалагічнымі прынцыпамі выступаюць наступныя:

– рацыянальны адбор сродкаў навучання з улікам інфармацыйнай ёмістасці адносна форм навучання і творчай спецыялізацыі;

– гібкае выкарыстанне аўдыторных і пазааўдыторных магчымасцей вучэбнага працэсу;

– вызначэнне прадметнай змястоўнасці паліталогіі ў рэчышчы фарміравання прафесійнай кампетэнтнасці будучых спецыялістаў;

– крытычная апрацоўка змен у рабочых і вучэбных праграмах, вучэбных планах, вучэбна-метады комплексах з мэтай стварэння дакладнага вучэбнага матэрыялу і дзеючай сістэмы вучэбных сітуацый;

– педагагічны аналіз мяркуемага вытворчага выхаду вучэбнага працэсу і магчымасцей студэнтаў адпавядаць новым патрабаванням;

– выкарыстанне сучасных педагагічных тэхналогій на занятках.

Аднак пры такім пазітыўнымі падыходзе трэба браць пад увагу і наступнае. З улікам гадзін, што па новых стандартах адведзены для заняткаў па паліталогіі, малаверагодна магчымасць ўкаранення такіх навучальных тэхналогій, як дзелавыя гульні, работа ў малых групах, адаптыўная тэхналогія, конкурсы, заняткі самаўпраўлення. Таму пры выбары метадаў вучэбнай дзейнасці трэба зыходзіць з магчымасцей рэжыму рэальнага часу, выкарыстоўваючы інфармацыйныя сеткі.

Наогул, педагагічныя тэхналогіі – гэта сукупнасць метадаў, метадычных прыёмаў, форм арганізацыі вучэбнай дзейнасці, асновай якіх з’яўляецца тэорыя навучання. Сучасныя тэхналогіі накіраваны на індывідуалізацыю, дыстанцыйнасць і варыятыўнасць адукацыйнага працэсу, акадэмічную мабільнасць навучэнцаў. Таму ўмацоўваецца сувязь паміж сучаснымі адукацыйнымі і інфармацыйнымі тэхналогіямі. Пад новымі інфармацыйнымі тэхналогіямі разумеюцца сучасныя сродкі і сістэмы інфармацыйнага абмену, якія забяспечваюць аперацыі па зборы, прадуцыраванні, накапленні, апрацоўцы, захаванні, перадачы інфармацыі. Прымяненне камп’ютарных сродкаў

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

дазваляе пашырыць праблемнае поле набыцця грамадска-палітычных ведаў, аператыўна ўспрымаць палітычныя падзеі, павысіць узровень самаадукацыі, набыць неабходныя матэрыялы для падрыхтоўкі да семінарскіх заняткаў і залікаў. Самастойная работа з электроннымі рэсурсамі ўключае арганізаваны студэнтамі пошук неабходных матэрыялаў, аналіз атрыманай інфармацыі, актывацыю творчай мабільнасці. Такая праца ператварае рэпрадукцыйную дзейнасць студэнта, якая перагружае яго механічную памяць і неактывуе мысленне, у актыўны творчы працэс, які суправаджаецца павышэннем матывацыі і зацікаўленасці. Кафедрай філасофіі падрыхтаваны электронны вучэбна-метадычны комплекс, які ўяўляе сукупнасць вучэбных, метадычных і кантрольна-ацэначных матэрыялаў; ён знаходзіцца ў электронным рэсурсе бібліятэкі БДУКМ.

Якімі рэальнымі магчымасцямі павышэння якасць адукацыі ў дадзенай сітуацыі валодае выкладчык? Перш за ўсё, для рэалізацыі лекцыйна-семінарска-залiковай сістэмы ў модульным варыянце трэба ахапіць тыя тэмы і пытанні, якія не ўвайшлі ў склад аўдыторных заняткаў. Кампенсаваць гэта можна, напрыклад, заданнямі падрыхтаваць даклады і рэфераты, тэмы якіх лагічна дапасоўваюцца да тэм семінараў, што дапаможа ахапіць сукупнасць пытанняў да заліку. Аднак асноўная нагрузка выпадае на самастойную работу студэнтаў. Менавіта ў працэсе самастойнай работы выпрацоўваецца неабходны запас ведаў, навыкаў і ўменняў, дзякуючы якім студэнты будуць здольны аналізаваць, асэнсоўваць і ацэньваць сучасныя падзеі, факты і вырашаць актуальныя праблемы на аснове адзінства тэорыі і практыкі.

Праблема якасці адукацыі адносна сацыяльна-гуманітарных дысцыплін ва ўмовах модульнай сістэмы яшчэ чакае свайго вырашэння. Аднак галоўным арыенцірам можна лічыць не толькі справу назапашвання студэнтамі ведаў, але і авалодання навыкамі самастойнага, канструктыўнага мыслення, фарміравання крэатыўнай кампетэнцыі і грамадзянскай адказнасці.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ